# Практыкум па тэме «Развіццё сусветных цывілізацый у Познім сярэднявеччы. Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага»

## Выяўленне заканамернасці і выпадковасці

**1.** У XIII ст. на палітычнай карце Еўропы з'яўляецца новая поліэтнічная дзяржава — Вялікае Княства Літоўскае (поўная назва — Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае). У працэсе яго фарміравання прыняло ўдзел усходнеславянскае і балцкае насельніцтва.

А. Назавіце горад — першую сталіцу Вялікага Княства Літоўскага. Растлумачце, чаму менавіта ён зрабіўся палітычным цэнтрам новай дзяржавы.

Б. Якія населеныя пункты з'яўляліся сталіцамі ВКЛ у розныя перыяды яго існавання?

В. Раскрыйце прычынна-выніковыя сувязі паміж знешнепалітычнай сітуацыяй ва Усходняй Еўропе ў пачатку XIII ст. і ўтварэннем ВКЛ.

Г. Ахарактарызуйце адносіны ВКЛ з краінамі-суседзямі.

Д. Як узнікненне новай дзяржавы паўплывала на фарміраванне беларускай народнасці?

Е. Успомніце з курса грамадазнаўства прыкметы дзяржавы. Раскрыйце іх змест на прыкладзе Вялікага Княства Літоўскага ў другой палове XIII — XV ст.

Ж. Зрабіце вывад пра тое, ці было ўзнікненне Вялікага Княства Літоўскага і яго росквіт выпадковасцю, ці заканамернасцю.

## Адрозненне факта ад меркавання

**2.** У дачыненні да эпохі Сярэднявечча можна сустрэць выраз «цёмныя вякі». Правядзіце ў класе дыскусію і вызначце, наколькі тэрмін «цёмныя вякі» можна прымяніць да тысячагадовага перыяду Сярэднявечча.

## Ажыццяўленне пошуку інфармацыі



**3.** Наша краіна мае багатую культурную і духоўную спадчыну, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў і беражліва перадавалася з пакалення ў пакаленне. Многія святы, звычаі і традыцыі былі шчыльна звязаны з земляробчым календаром. Жыццё беларускага селяніна цалкам залежала ад добрага ўраджаю, таму невыпадкова значная роля адводзілася абрадам, якія суправаджалі палявыя работы. Асаблівае месца сярод іх займалі Дажынкі, якія знаменавалі заканчэнне жніва. Яны суправаджаліся асаблівымі рытуальнымі дзеяннямі, якія мелі глыбокі сакральны сэнс.



Традыцыя ладзіць Дажынкі захавалася да нашых дзён. Цяпер гэта штогадовы рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў (рэспубліканскія «Дажынкі»). Першапачаткова сталіцай фестывалю рабіўся адзін з беларускіх гарадоў. Пачынаючы з 2015 г. Дажынкі праводзяцца ў адным з населеных пунктаў кожнай вобласці. Мяняючы месца свайго правядзення, фестываль дапамагае кардынальна перамяніць вонкавы выгляд малых гарадоў Беларусі. Добраўпарадкоўваюцца вуліцы, дарожная інфраструктура, рэканструююцца або ўзводзяцца сацыяльныя аб’екты.

А. Даведайцеся, як нашы продкі адзначалі Дажынкі. Раскажыце пра асноўныя абрадавыя дзеянні, растлумачце іх сэнсавае значэнне.

Б. Калі ўпершыню пачалі праводзіць рэспубліканскія «Дажынкі»? Які населены пункт Беларусі быў ушанаваны гонарам прыняць першы фестываль і чаму?

В. Назавіце найважнейшыя складнікі гэтага свята ў сучаснай Беларусі.

Г. Якія каштоўнасці беларускага народа, на ваш погляд, захоўвае сучаснае свята «Дажынкі»?

## Аддзяленне галоўнага ад другараднага

**4.** Эпоха Позняга сярэднявечча ў Еўропе адзначылася многімі пераўтварэннямі, якія адбыліся ў жыцці асобных народаў і рэгіёнаў і зрабіліся агульнаеўрапейскімі тэндэнцыямі гістарычнага развіцця.

А. Пакажыце 2—3 ключавыя змены, якія адбыліся ў розных галінах жыцця еўрапейскага грамадства ў Познім сярэднявеччы.

| Сацыяльная сфера грамадства | Палітычная сфера грамадства |
|---|---|
| | |
| Эканамічная сфера грамадства | Духоўная сфера грамадства |
| | |

Б. Выявіце і растлумачце прычынна-выніковыя сувязі паміж вылучанымі вамі зменамі.

В. Ці былі вылучаныя вамі тэндэнцыі гістарычнага развіцця Еўропы ў Познім сярэднявеччы характэрныя для тэрыторыі Беларусі? Канкрэтызуйце свой адказ фактамі.

## Вызначэнне ролі асобы ў гісторыі

**5.** Успомніце імёны вядомых людзей, якія жылі на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIII — XV ст., і выканайце заданні.



*Помнік у г. Гродна*



*Помнік у г. Полацк*

А. Вызначце гістарычных дзеячаў, якім прысвечаны помнікі, прадстаўленыя на ілюстрацыі. Як вы лічыце, чаму менавіта ў гэтых гарадах увекавечылі іх памяць? Якую ролю ў гісторыі нашай краіны адыгралі гэтыя асобы?

Б. Устанавіце адпаведнасць паміж выявай гістарычнай асобы і характарыстыкай яе дзейнасці. Атрыманыя вынікі ўнясіце ў табліцу «Князі Вялікага Княства Літоўскага». Дапоў-

ніце табліцу інфармацыяй яшчэ пра аднаго вялікага князя літоўскага (на выбар). Зрабіце вывад наконт ролі кіраўнікоў дзяржавы ў станаўленні і развіцці Вялікага Княства Літоўскага.

А



Б





В



Г

1. Адзін з самых вядомых князёў Вялікага Княства Літоўскага. Аднавіў самастойнасць ВКЛ, цэнтралізаваў уладу ў дзяржаве. Пры ім ВКЛ дасягнула найбольшых памераў і магутнасці.

2. Князь Вялікага Княства Літоўскага, які «...не піў ні віна, ні піва, меў вялікі розум і скарыў многія землі. Таемна рыхтаваў свае паходы, выяваў не столькі лікам, колькі ўменнем». Тэрыторыя ВКЛ за час яго праўлення павялічылася ўдвая.

3. Літоўскі князь, які «адных сваіх супраціўнікаў забіў, другіх выгнаў з Літвы і стаў княжыць адзін ва ўсёй зямлі Літоўскай». Каранаваўся ў Навагародку, жорстка распраўляўся са сваімі ворагамі. Загінуў у барацьбе за ўладу.

4. Вялікі князь літоўскі, які ўвайшоў у гісторыю як мудры, верацярпімы ўладар. «Не разбураць старызны, не ўводзіць навізны» — прынцып яго дзяржаўнага праўлення. Прыняў тытул «караля Літвы і Русі», заснаваў дынастыю вялікіх літоўскіх князёў.

| Князь | Характарыстыка / выява | Гады праўлення | Асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |